УДК 811.161.3

# Некаторыя аспекты аналізу ролі параграфем

Гіруцкая Л.А.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

З'яўляючыся спецыфічнай формай рэалізацыі мовы, маўленне праяўляецца ў вуснай і пісьмовай формах. Характэрныя асаблівасці вуснага маўлення – багатыя інтанацыйныя магчымасці, выразнасць жывога гучання, паўзы, мелодыка, лагічны націск – здольныя перадаваць складанасць і разнастайнасць пачуццяў, адценні думак, унутраных перажыванняў аўтара выказвання. Пісьмовы тэкст, будучы своеасаблівым *графічным эхам* (выраз Б.А. Плотнікава) вуснай мовы, выпрацаваў спецыфічныя сродкі адэкватнага яе адлюстравання. Ён уяўляе сабой арганічную еднасць вербальных і невербальных сродкаў перадачы інфармацыі (параграфем).

Сучасны пісьмовы тэкст без параграфічных сродкаў не існуе. Найбольш натуральныя і распаўсюджаныя параграфемы – малюнкі, фатаграфіі, знакі прыпынку, лічбы, розныя спосабы напісання літар. Параграфічнымі сродкамі з'яўляюцца таксама шрыфты, колер, прабелы, абзацы, чляненні па раздзелах, главах, параграфах, падкрэсліванні, парадак размяшчэння кампанентаў тэксту (загалоўкаў, прозвішчаў аўтараў). Некаторыя віды пісьмовых тэкстаў маюць такія невербальныя сродкі, якія немагчыма перадаць вусным маўленнем. Асабліва гэта характэрна для навуковага стылю, у тэкстах якога ў прапарцыянальна розных адносінах у адпаведнасці з падстылем і жанрам прысутнічаюць такія параграфемы, як складаныя малюнкі, схемы, формулы, дыяграмы, чарцяжы, сімвалы, графікі. Так, многія матэматычныя тэксты практычна з'яўляюцца параграфемнымі, бо складаюцца з формул, злучаных лаканічнымі вербальнымі звязкамі.

На занятках па дысцыпліне "Беларуская мова (прафесійная лексіка)" параграфічныя кампаненты разглядаюцца пераважна пры вывучэнні структуры і сродкаў арганізацыі навуковага тэксту. Думаецца, што надзвычай карысна ў вучэбным плане прааналізаваць магчымасці параграфем, у тым ліку знакаў прыпынку, для размежавання пісьмовых тэкстаў па стылях, а ў некаторых выпадках – падстылях і жанрах.

Знакі прыпынку падрабязна разглядаюцца ў дакладзе як асаблівасць вербальнага тэксту, спыняецца ўвага на іх інтэрнацыянальным характары, двайной функцыі (структурызацыя думкі і замяшчэнне прасадычных кампанентаў вуснага маўлення), полісеміі, сінаніміі, антаніміі і аманіміі, ролі як кампанента граматнасці і адукаванасці навучэнцаў.

Даклад суправаджаецца шасцю старонкамі ілюстрацыйнага матэрыялу.